Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «АЛЕВКУРП», г. Минск, ул. П. Бровки, д. 6, ком. 332 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Инвентарный номер | Общая площадь | Назначение |
| **Хранилище БТИ** | 610/С-35343 | 2 488 кв.м | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ |
| Месторасположение предмета аукциона: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чаловской, д. 19 | | | |
| **Сведения о земельном участке:** Земельный участок пл. 0.9995 га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 16.10.2032) для обслуживания здания хранилища БТИ. Ограничения прав: участок площадью 0.0016 га — охранная зона линий электропередачи, участок площадью 0.0247 га — охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % — 4 717 346 400 белорусских рублей (с учетом деноминации — 471 734 рубля 64 копейки)** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** календарных дней после проведения аукциона. | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцать) календарных дней** с даты заключения договора купли-продажи. | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **12.07.2016** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом.1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.07.2016** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | |
| **Контактные телефоны:** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | |

## Объявление о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | Лот №1. Капитальное строение инв. №240/С-41347, наименование – склад хранения нефтепродуктов, общей площадью 654 кв.м Первоначальная стоимость – 1 710 000 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО «СоМеТ» УНП 391427842 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Орша, ул. Марата, 214 |
| **Информация об обременениях** | без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 1 30 июня 2016 года в 12.00 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211030, г .Орша, ул. Островского, 36 Главный специалист — Маханькова Анастасия Александровна, тел. 80216543202, 80336161412. Начальник отдела — Павлюченкова Наталья Евгеньевна, 80216543213 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, не позднее 29.06.2016г. Минимальная величина первого шага — 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## К сведению акционеров ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»

В соответствии с решением Общего собрания акционеров (протокол № 28 от 30 марта 2016 года) 30 мая закончена выплата дивидендов акционерам ОАО по результатам работы Общества за 2015 год в установленные собранием сроки через филиалы ОАО «АСБ Беларусбанк» и РКЦ № 42 ОАО «Белагропромбанк», а также почтовыми переводами по Республике Беларусь.

Справки по тел. (8-01795) 45-3-28.

Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»

УНП 600075003

## Информационное сообщение
### о формировании реестра акционеров ОАО «Веста»

ОАО «Веста» осуществляет раскрытие информации в соответствии со ст. 56 Закона Республики Беларусь «О рынке ценных бумаг» о формировании согласно решению Наблюдательного совета ОАО «Веста» от 17 мая 2016г, протокол № 2, реестра акционеров ОАО «Веста» по состоянию на 19 мая 2016г в целях формирования списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем Собрании акционеров ОАО «Веста», запланированном к проведению 13 июня 2016г.

ОАО «Веста»

УНП 300200651

## Сведения о сделках ОАО «Веста»,
### в совершении которых имелась заинтересованность его аффилированных лиц

| Стороны сделки 2016 год | Предмет сделки | Критерий заинтересованности | Предполагаемая выгода для стороны сделки |
|---|---|---|---|
| ОАО «Веста» и ОАО «Универсалторг» г. Новолукомля | Предоставление в аренду оборудования | Является стороной сделки | Получение арендной платы |

ОАО «Веста»

УНП 300200651

## Информационное сообщение
### о выплате дивидендов по акциям ОАО «Веста» за 2015 год

ОАО «Веста», расположенное по адресу: 210001, г.Витебск, ул. Комсомольская, 15, телефон 8 0212 36-53-54, сообщает, что в соответствии с принятым 22.03.2016 Общим собранием акционеров данного общества решением 13, 14, 15 апреля 2016 года были выплачены дивиденды.

Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составлен в соответствии с реестром акционеров ОАО «Веста» по состоянию на 22.02.2016 г.

ОАО «Веста»

УНП 300200651

■ Сезон

# ПЕРШЫЯ КЛУБНІЦЫ, ПЕРШЫЯ ЎРАЖАННІ...

## Пакуль надвор'е не спрыяе сапраўднаму смаку ягады

**Большасць з нас, напэўна, ужо паспела паласавацца першымі клубніцамі. Разбежка цэн на ягады ў сталіцы зараз — ад 25 да 65 тысяч рублёў за кілаграм у залежнасці ад памеру ягад і месца іх продажу.**

Напрыклад, учора на Камароўцы клубніцы прадавалі па 25-35 тысяч, а каля станцыі метро "Каменная Горка" — па 45-50 тысяч рублёў за кілаграм. Такая ж сітуацыя са смакам: нехта нахвальвае першую духмяную ягаду, а хтосьці кажа, што клубніцы пакуль так сабе, цвердаватыя і не салодкія. Апошніх, напэўна, больш, і яны маюць рацыю: умовы надвор'я апошніх дзён яўна не спрыялі паляпшэнню смакавых якасцяў ягад.

Гэта нам пацвердзілі і ў Лунінецкім раённым спажывецкім таварыстве. Лунінеччына, як вядома, клубнічны край.

— Сезон фактычна пачаўся з панядзелка. І вы ж бачыце, які ён атрымаўся? З-за нізкіх тэмператур клубніцы не хочуць расці — апошнія два дні ўвогуле былі замаразкі. Буйных ягад пакуль мала, пераважаюць сярэднія. Адпаведна, і закупачныя цэны для насельніцтва пакуль не зацверджаны, — расказалі нам спецыялісты спажывецкага таварыства. — Першыя, так званыя «таварныя» ягады людзі традыцыйна збываюць самастойна. Цэны на іх рэгулюе рынак. Сёння яны складаюць да 15 тысяч рублёў. (Суразмоўца робіць паўзу і працягвае, маўляў, калегі падказваюць, што цана змянілася ўжо да 20 тысяч рублёў за кілаграм.) Яна можа змяняцца цягам дня, усё залежыць ад колькасці прадаўцоў і колькасці машын пакупнікоў. Няма прадаўцоў, закупачная цана большая і наадварот.



На сёлетні сезон Лунінецкаму раённаму спажывецкаму таварыству зацверджаны план нарыхтоўкі клубніц у памеры 280 тон. Летась гэтая лічба складала 300 тон, але па факце атрымалася 220 тон. Усё з-за ўмоў надвор'я. Гэтак жа і сёлета ўсё — і цэны, і смак ягад, і ўвогуле працягласць сезона — будзе залежаць ад карэктыў, якія ўнясе «нябесная канцылярыя»...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Далёкае-блізкае

# НУЛЬ ВЫКІДАЎ $CO_2$ ЯК ТУРЫСТЫЧНАЯ «РАЗЫНКА»

## Браслаўскі раён можа стаць першым кліматычна нейтральным муніцыпалітэтам Беларусі

Сёлета ў красавіку наша краіна падпісала Парыжскае пагадненне па клімаце. Згодна з ім узяла на сябе абавязацельства зменшыць колькасць выкідаў парніковых газаў на 28% у параўнанні з паказчыкамі 1990 года. Адказнасць за гэтыя лічбы кладзецца на плечы кожнага горада краіны. Паступова яны далучаюцца да «пакта мэраў» — добраахвотнай ініцыятывы Еўрапейскага саюза, згодна з якой гарады бяруць на сябе абавязацельствы па ўстойлівым развіцці энергетычнага сектара ў сваім муніцыпалітэце і скарачэнні выкідаў вуглякіслага газу не менш, чым на 20% да 2020 года.

Браслаў падпісаў «пакт мэраў» у канцы 2014 года. Гораду пашанцавала: падаўшы заяўку на ўдзел у праекце Еўрасаюза, ён атрымаў фінансавыя сродкі для правядзення дэманстрацыйных энергаэфектыўных мерапрыемстваў. У рамках праекта эксперты правялі аналіз спажывання энергіі Браслаўскім раёнам, зладзілі дэманстрацыйныя энергаэфектыўныя мерапрыемствы. Ініцыятыва аказалася настолькі ўдалай, што ў рамках іншага праекта было вырашана зрабіць Браслаўскі раён першым беларускім кліматычна нейтральным муніцыпалітэтам: гэта значыць, з дапамогай кампенсацыйных мер выкіды вуглякіслага газу будуць зведзены да нуля. Новы праект рэалізуецца да верасня 2018 года.

— Браслаўскі раён выдатна падыходзіць для такога праекта, — адзначыў **намеснік старшыні Браслаўскага райвыканкама Міхаіл ПЛІСКО.** — У раёне няма буйной прамысловасці, пераважаюць сельскагаспадарчая вытворчасць і сфера паслуг. «Разынкай» Браслаўшчыны з'яўляецца турызм. Тут ёсць усе перадумовы для падрыхтоўкі і рэалізацыі праграмы па істотным скарачэнні выкідаў вуглякіслага газу.

Браслаўшчына можа дасягнуць кліматычнай нейтральнасці дзякуючы лясам, якія, як вядома, паглынаюць шмат $CO_2$. На кацельнях можна адмовіцца ад торфу і выкарыстоўваць мясцовыя віды экалагічнага паліва: дранку, салому. Аднак гэта толькі прыкладныя стратэгічныя кірункі.

— Цяпер трэба прыдумаць, што неабходна зрабіць для таго, каб раён стаў кліматычна нейтральным да 2030 года. Для гэтага мы распрацуем доўгатэрміновы план дзеянняў і пачнём яго рэалізацыю, — расказаў **кіраўнік праекта «Браслаўскі раён — першы кліматычна нейтральны муніцыпалітэт у Беларусі» Дзмітрый БУРОНКІН.**

Стратэгічны план развіцця раёна будзе распрацаваны з улікам прапаноў насельніцтва і грамадскіх арганізацый. Яго падмуркам стане базавае экспертнае даследаванне выкідаў і спажывання вуглякіслага газу ў раёне. Ва ўдзельнікаў праекта будзе магчымасць пераняць лепшыя практыкі ў азнаямляльных турах па еўрапейскіх гарадах, якія ўжо працуюць у галіне кліматычнай нейтральнасці.

Дарэчы, кліматычная нейтральнасць можа стаць прывабнай турыстычнай «разынкай» раёна. Для турыстаў плануецца стварыць маршрут па мясцінах, дзе праведзены кліматычна нейтральныя мерапрыемствы. Браслаўшчына прапануюць зменшыць транспартную нагрузку, выкарыстоўваючы дружалюбны да прыроды транспарт — веласіпеды. У Браслаўскім музеі з'явіцца выстаўка па энергаэфектыўнасці «Браслаў 2030 года», якая пакажа экалагічную будучыню раёна. Не абыдуць бокам і саміх гараджан: для розных мэтавых аўдыторый прэзентуюць практычныя рэкамендацыі па энергазберажэнні ў побыце. У горадзе з'явіцца грамадскі інфармацыйны цэнтр па энергаэфектыўнасці.

Ужо сёлета ў Браславе збіраюцца замяніць участак цеплатрасы і паставіць лямпачкі святлодыёднага асвятлення ў горадзе (мяркуецца замяніць 5% гарадскога асвятлення). У дзіцячым садку будзе ўстаноўлены сонечны калектар, а ў шматпавярховым доме — цеплаабменнікі. Грамадскія месцы будуць абсталяваны аднаўляльнымі крыніцамі энергіі. Кожнае мерапрыемства скарачае спажыванне энергіі канкрэтнага аб'екта на 20-30%. Агулам кіраўнікі праекта ставяць перад сабой мэту знізіць энергаспажыванне ўсяго раёна на 1-2%, што дазволіць сэканоміць вялікія энергетычныя і грашовыя рэсурсы.

**Кацярына РАДЗЮК.** *radziuk@zviazda.by*

■ Добрая традыцыя

# МАГЧЫМАСЦЬ САБРАЦЦА РАЗАМ

## АКТЫВІСТЫ «БЕЛАЙ РУСІ» НАВЕДАЛІ КАНЦЭРТ У ФІЛАРМОНІІ

**«Любімая класіка» — так называўся канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі, паслухаць які днямі сабраліся актывісты і сябры грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Музычны вечар быў арганізаваны спецыяльна для таго, каб аднадумцы, паплечнікі ў непрацоўнай атмасферы змаглі сустрэцца, абмяняцца сяброўскімі ўсмешкамі і падтрымаць адно аднаго.**

— Гэта канцэрт, які мы ўжо другі раз праводзім для нашага актыву, — адзначыў **намеснік Старшыні грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр ШАЦЬКО.** — Набылі ўсе квіткі ў залу і далі магчымасць паслухаць добрую музыку сваім найбольш актыўным удзельнікам, сябрам, тым, хто нас пастаянна падтрымлівае, — супрацоўнікам сферы культуры, прадстаўнікам адміністрацыі. Такія канцэрты, спадзяюся, стануць традыцыяй. Бо гэта тое, што нас насамрэч аб'ядноўвае.

— Мы шмат праводзім розных мерапрыемстваў, але магчымасць сабрацца ўсім разам выпадае не часта, — дадаў Аляксандр Шацько. — Людзей на вызваленых пасадах можна пералічыць па пальцах адной рукі, а ў большасці ўдзельнікаў ёсць яшчэ і асноўная праца. У вольны час яны займаюцца справамі нашага аб'яднання. Таму хочацца сказаць ім «дзякуй», проста пагутарыць і падзяліцца думкамі.

У сімфанічнай праграме, якую слухалі тым вечарам, гучаў славуты паланэз Міхала Клеафаса Агінскага — музыка сапраўды блізкая большасці нашага народа. Можна было пачуць таксама кампазіцыі, напісаныя Чайкоўскім, Глінкам, Вівальдзі, Брамсам і іншымі выдатнымі кампазітарамі.

Аляксандр Шацько заўважыў, што ў іх аб'яднанні цікавяцца не толькі класічнай музыкай, але і народнай. Ладзілася сумесная праграма з ансамблем «Бяседа». Калектыву быў арганізаваны тур па краіне, адбыўся вялікі канцэрт у Палацы Рэспублікі, у тым ліку і для актывістаў аб'яднання.

Пытанні палітычнага жыцця прадстаўнікі «Белай Русі» плануюць абмяркаваць на рэспубліканскай нарадзе, якая адбудзецца 18 чэрвеня: там збярэцца каля 500 чалавек з усёй краіны. Увага будзе скіравана на асноўныя працоўныя моманты, звязаныя з выбарамі ў парламент.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*